ми информационными службами в пределах их географической доступности и при условии использования их информационных ресурсов как самой библиотекой, так и ее пользователями (преподавателями и учащимися).

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

## КРАЯЗНАЎЧЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ АБЛАСНЫХ БІБЛІЯТЭК У ДАПАМОГУ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складанасць краязнаўства як грамадскай з'явы патрабуе ад бібліятэк улічваць усе праяўленні краязнаўства, у т. л. яго інфармацыйнага забеспячэння як навуковай дысцыпліны. Краязнаўства як навуковая дысцыпліна развіваецца ў двух напрамках: як комплексная навуковая дысцыпліна і па асобных галінах: гістарычнае, генеалагічнае, геаграфічнае, этнаграфічнае, літаратурнае, мастацтвазнаўчае, тапанімічнае і інш. Важна адзначыць, што многія краязнаўчыя навуковыя дысцыпліны ўвайшлі ў адукацыйныя праграмы ўніверсітэтаў, устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, школ і гімназій.

Інтэграваная вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства» выкладаецца студэнтам спецыяльнасці 1-89 01 01 «Туризм и гостеприимство» ў БДУ, Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Полацкім, Палескім дзяржаўных універсітэтах і інш. Па гэтай жа спецыяльнасці, але ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі, выкладаецца вучэбная дысцыпліна «Краеведение Беларуси», а таксама гэта дысцыпліна ёсць і на філалагічных факультэтах універсітэтаў.

Адукацыйныя праграмы ўключаюць шматлікія краязнаўчыя вучэбныя дысцыпліны, адпаведныя будучай спецыяльнасці. Так, будучыя гісторыкі, студэнты спецыяльнасці 1-23 01 12 «Музейное дело и охрана историко-культурного наследия (по

направлениям)» вывучаюць «Гістарычнае краязнаўства» (БДУ, БДУКМ, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны і інш.); «Краеведение с основами музееведения» (БДУ); «Краеведение и этнография Беларуси» (Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт). «Краязнаўства і этналогія», «Літаратурнае краязнаўства», «Краеведение и этнология Беларуси» ўваходзяць у склад дзяржаўнага кампанента адукацыйнай праграмы I ступені для спецыяльнасці «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» ў Мазырскім дзяржаўным універсітэце, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова; дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» і «Краязнаўчае крыніцазнаўства» выкладаюцца студэнтам спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)» у БДУКМ і інш.

У адукацыйных праграмах агульнай сярэдняй адукацыі вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства» і галіновыя сумежныя прадметы прадстаўлены ў якасці факультатыўнага кампанента. Штогод Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прымае «Перечень УМК, программ факультативных занятий, рекомендованных Министерством образования». У апошнія гады ў ім рэкамендаваліся ВМК «Мой родны кут… (краязнаўства)» для 5 класа, праграмы «Беларуская антрапаніміка» для 8 класа, «Беларуская тапаніміка» для 9 класа (2017/18 навучальны год). Праграмы факультатыўных заняткаў: «Храмы, замкі і палацы Беларусі» для 7 класа; «Генеалогическое древо моей семьи» для 10 класа і інш. На 2018/19 навучальны год таксама запланавана факультатыўная вучэбная дысцыпліна «Краязнаўства», якая напаўняецца рэгіянальным зместам. Так, факультатыўна выкладаюцца ў школах «Стаўбцоўшчыназнаўства», «Магілёвазнаўства» і іншыя вучэбныя дысцыпліны.

Важныя педагагічныя задачы выконваюцца і рэспубліканскімі арганізацыямі, мэтай якіх з’яўляецца дапамога школе і настаўнікам у арганізацыі свабоднага часу навучэнцаў. Гэта УА «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» і дзяржаўная ўстанова «Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства». Гэтыя дзяржаўныя ўстановы праводзяць вялікую праектную, экспедыцыйную, экскурсійную, навукова-даследчую і іншую работу з навучэнцамі і педагогамі, заахвочваючы моладзь да ўсебаковага вывучэння сваёй малой радзімы, адраджэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіянальных культурных традыцый і абрадаў, захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы і краіны. Міністэрствам адукацыі ў 2017 г. зацверджана «Типовая программа дополнительного образования детей и молодежи (туристско-краеведческий профиль)», у якой вызначаны мэты, задачы гэтага профілю як у цэлым, так і асобных адукацыйных абласцей. Дысцыпліна «Краязнаўства» ахоплівае гістарычнае і геаграфічнае краязнаўства, культуру края і музеезнаўства, формы і метады рэалізацыі гэтых кірункаў [1].

Удзельнічаць разам з установамі адукацыі ў рэалізацыі пэўных формаў распаўсюджвання краязнаўчых ведаў уласціва музеям і бібліятэкам. Так, урокі па курсу «Полацказнаўства» для 6–8 класаў прапанаваны Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам як платная паслуга па тэмах: «Беларускі першадрукар Францыск Скарына», «Сімяон Полацкі. Жыццё і дзейнасць», «Рамёствы і гандаль сярэдневяковага Полацка» і інш. Бясспрэчна інфармацыйнае забеспячэнне краязнаўства функцыянальна адносіцца для спецыяльных бібліятэк, якія функцыянуюць ва ўніверсітэтах, школах і іншых установах адукацыі.

Разам з тым, абласныя ўніверсальныя бібліятэкі (АУБ), якія з’яўляюцца прызнанымі цэнтрамі інфармацыйнага забеспячэння сферы адукацыі ў рэгіёнах, галоўнымі рэгіянальнымі цэнтрамі інфармацыйнага забеспячэння краязнаўства, цэнтрамі бібліятэчнага краязнаўства, маюць шырокія магчымасці для ўдзелу ў інфармацыйнай падтрымцы адукацыйнага працэсу, навукова-даследчай і выхаваўчай дзейнасці студэнтаў, навучэнцаў, выкладчыкаў, арганізатараў пазакласнай работы ў кантэксце адукацыйных праграм па краязнаўстве як навуковай і вучэбнай дысцыпліне.

Падставай з’яўляюцца багатыя краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы, універсальныя па зместу: гэта краязнаўчыя і мясцовыя дакументы ў фондах АУБ, якія характарызуюцца шырокім тыпа-відавым складам, храналагічнай глыбінёй, шматмоўнасцю, у апошнія гады – дынамічным ростам мультымедыйных і іншых электронных рэсурсаў. Інтэлектуальны доступ да гэтых фондаў і калекцый забяспечваецца краязнаўчымі пошукавымі сістэмамі, якія вызначаюцца ў цэлым у краіне даволі высокім узроўнем арганізацыі і ўніфікаванасці. Тэндэнцыяй з’яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэс інтэграцыі краязнаўчай часткі дакументнага фонду, у дадзеным выпадку АУБ, у размеркаваны сукупны бібліятэчны фонд нацыянальных дакументаў, які фарміруецца бібліятэкамі і іншымі сацыяльнымі ўстановамі інфармацыйнай інфраструктуры краіны і адпаведных пошукавых сістэм у інтэграваную пошукавую сістэму – электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі і, у будучым, нацыянальную электронную бібліятэку Беларусі.

Многія краязнаўчыя дакументы, па сутнасці, могуць быць выкарыстаны як крыніцы для забеспячэння адукацыйных, навуковых і выхаваўчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

Алічбаванне вучэбных матэрыялаў па краязнаўстве з’яўляецца прыярытэтам бібліятэк навучальных устаноў (рэпазіторыі і інш.), а абласныя бібліятэкі рыхтуюць самі і з партнёрамі лічбавыя копіі тых дакументаў, якія выступаюць як каштоўныя крыніцы краязнаўчых ведаў. Гэта кірунак аптымальнага ўзаемадзеяння паміж бібліятэкамі розных тыпаў і відаў па напрамку інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці па краязнаўстве. Значнасць алічбоўкі вучэбных матэрыялаў па краязнаўстве бібліятэкамі і забеспячэння доступу да анлайн-рэсурсаў, якія могуць быць крыніцай інфармацыі аб рэгіёнах, падкрэсліваюць замежныя спецыялісты [2]. Абласныя бібліятэкі разам з партнёрамі (Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, універсітэтамі і музеямі) прымаюць актыўны ўдзел у дыгіталізацыі выданняў – каштоўных крыніц краязнаўства. Такімі сталі мультымедыйныя кампакт-дыскі «Памятных кніжак…» беларускіх губерняў, «Юзаф Ігнацый Крашэўскі» (1812–1887), «Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919): документы и материалы», «Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864–1915)» і інш.

Створаныя АУБ багатыя і разнастайныя па зместу ІР, дзякуючы спалучэнню ўніверсальнасці і спецыяльнай тэматыкі, лагічна карэліруюць са змястоўным напаўненнем краязнаўчых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца ў сістэме адукацыі краіны. Данае сцвярджэнне падмацоўваецца разглядам кантэнту пошукавых краязнаўчых сістэм, якія мадэлююць фонды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчых дакументаў, калекцый і патокі знешняй фіксаванай інфармацыі аб краі. Так, Магілёўская АБ стварыла паўнатэкставую БД «Край мой – Магілёўшчына», фактаграфічную БД «Таленты ад роднай зямлі», прысвечаную пісьменнікам-землякам, праект «Малая родина. Деревеньки с большой историей», віртуальныя выставы «Беларусы свету з Магілёўчыны», «Магілёўшчына ў гады Першай сусветнай вайны», «Могилевская губерния на страницах периодических изданий» і інш. Бясплатныя курсы «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» рэалізаваны Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна сумесна з кафедрай гісторыі Беларусі ВДУ імя П. М. Машэрава, клубам гістарычнай рэканструкцыі *Vargentorn* і Віцебскім гарадскім парталам. Курсы праходзяць на базе Віцебскай АБ двойчы ў месяц для ўсіх жадаючых. Удзельнікам прапанаваны тэматычныя лекцыі, кансультацыі запрошаных экспертаў, фота- і відэаматэрыялы, дыскусіі па асноўных этапах гісторыі горада. Да кожнай тэмы лекцый дадаюцца спісы рэкамендаванай літаратуры. Рэсурс даступны ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».


*1.* Республиканский центр экологии и краеведения. Отделение краеведения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://rctkum.by/uploads /docs/ tipovaj%20turist_kraeved.pdf. – Дата доступа: 8.11.2018.

*2. Nashwalder, K.* The role of public libraries in delivering local studies services, with a case study of Wiltshire [Electronic resource] / K. Nashwalder. – Mode of access: https://core.ac.uk/download/pdf/10186377.pdf. – Date of access: 12.11.2018.



***И. А. Смирнова,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*профессор кафедры искусства эстрады*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*


## САУНД-ДИЗАЙН КАК КОМПОНЕНТ ДРАМАТУРГИИ ФИЛЬМА «ОБУВЬ, ЗАПЯТНАННАЯ КРОВЬЮ»

Современное кино Китая характеризуется не только освоением новых технологий, диапазон которых поистине огромен, но и поиском новых средств выразительности в синтетических



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ